# РАСПРАЦОЎКА ГЕНЕАЛАГІЧНАГА ДРЭВА СЯМ'І

*Вярбіцкая В.І.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г.Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Наўроцкая І.В. – старшы выкладчык*

Абгрунтоўваецца важнасць і значнасць гістарычнай памяці пра сям'ю, род і продкаў на прыкладзе распрацоўкі генеалагічнага дрэва. Апісаны этапы і аспекты гістарыяграфічнай работы па складанні генеалогіі.

У наш час вельмі важна асэнсоўваць важнасць сям'і. Што датычыцца мяне, яна з'яўляецца рухальнай сілай у маім жыцці і крыніцай падтрымкі. Я бачыла сваім абавязкам задакументаваць усе гісторыі і рассказы пра сваю вялікую сям'ю, якія я калісьці чула ад бабуль і дзядуль.

Сваю працу я пачала ў лютым 2018 года з вывучэння гісторыі Беларусі і яе адміністрацыйнага дзялення ў розныя перыяды. Для гэтага я наведвала гарадскую бібліятэку горада Дзяржынска, розныя сайты па генеалогіі і гісторыі Беларусі ў інтэрнэце, напрыклад, сайты «Памяць народа», «Маё сямейнае дрэва», партал Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і іншыя. Сабраўшы агульную інфармацыю пра ўезды, у якіх прыкладна пражывалі мае продкі, я пачала апрошваць жывых носьбітаў інфармацыі: бабулей і дзядулей. Гэтыя гісторыі можна лічыць унікальнымі, бо ні адзін гістарычны дакумент не зможа так дакладна апісаць выгляд, звычкі і характар тых, каго ўжо няма. Асаблівай каштоўнасцю можна лічыць фотаздымкі, лісты і асабістыя дакументы. З гэтага моманту пачаўся аналіз сабранай інфармацыі і вядзенне«дзённіка».

У асяроддзі архівістаў распаўсюджаны такі выраз: «Калі сабраў усё, што можна, у жывых – ідзі да мёртвых. На могілкі, дзе пахаваны продкі». Я адправілася шукаць дакладныя даты нараджэння сваякоў на могілках. Там былі пахаваны Вяржбіцкі Феадар, Вяржбіцкі Захар, Вяржбіцкі Мікалай, Вяржбіцкі Аляксей і Вярбіцкая Алена. Перапісаўшы імёны і імёны па бацьку, даты нараджэння і смерці, пачалося фарміраванне генеалагічнага дрэва. І наступны мой крок – Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГАРБ).

У маі 2018 года я прыступіла да працы ў НГАРБ. Спачатку неабходна было напісаць заяву на імя дырэктара архіва з дакладным указаннем данных продкаў, месцажыхарства і веравызнання; зрабіць асабісты пропуск з фота для доступу да гістарычных архіўных дакументаў.


Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

дазвол на выдачу

дата, пасада, подпіс

**Заказ на выдачу спраў**

Для каго [illegible]

Мэта і тэма даследавання радавод [illegible]

| № фонда | № вопіса | № справы | Загаловак справы | К-сць аркушаў | Распіска карыстальніка | Дата і распіска заг. чыт. залы | Дата і распіска аб вяртанні спраў у сховішча |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 136 | 13 | 228 | | | | | |
| | 14 | 327 т.1 | [illegible] приход | | | | |
| | | | | | | | |
| | | | | | | | |
| | | | | | | | |

Подпіс [signature]

Дата 02.05.18

Малюнак 1 – Фармуляр для заказу архіўных дакументаў

Наступны этап працы ў архіве – па веравызнанні і назве населенага пункта трэба вызначыць на карце рэспублікі, ці захаваліся архіўныя даныя. Самы галоўны і непрыемны факт ў даследаванні – большасць дакументаў у час Вялікай Айчыннай вайны былі спалены ці не захаваліся. Для працы з архіўнымі дакументамі неабходна зрабіць заказ. Ён апрацоўваецца на працягу тыдня: дакументы неабходна выгрузіць са сховішча і падрыхтаваць да работы. Пошук дакументаў ажыццяўляецца ў залежнасці ад выбранай губерні або ўезда. Яшчэ адна цяжкасць – 50% дакументаў на польскай ці старабеларускай мовах. Шмат якія дакументы ў непрыгодным стане: парваныя старонкі, зношаныя пераплёты. Таму, большасць з іхперавялі ў лічбавы варыянтабо не выдаюцьзусім. Усе дакументы – рукапісныя, што ўскладнялапошук інфармацыі і прабавала шмат часу.

Найбольш каштоўнымі кнігамі ў архіве былі метрыкі. Метрыкі – гэта кнігі для афіцыйнага запісу актаў грамадзянскага стану: нараджэння, шлюбу і смерці. Мне давялося знайсці сведчанне аб тым, што ў маім родзе былі прыгонныя і дзяржаўныя сяляне, былі як каталікі, так і праваслаўныя.

Паўтары гады двойчы на тыдзень я праводзіла свае дніса скарбніцайгісторыі. Пасляпраглядубольш за дзясятакархіўныхдакументаў, я адправілася ў НацыянальныархіўРэспублікі Беларусь і НацыянальнуюбібліятэкуБеларусі. Паралельнапрацуючы ў двух архівах, я пачалараспрацоўвацьканцэпт для кнігіпрагенеалогіюмаёйсям'і. Кожныкрок, кожныдакументнеабходна было аналізаваць і сістэматызаваць у адпаведнасці з ужо знойдзенымігістарычнымі данымі.

Болей за два дзясятка кніг і архіўных дакументаў прыадчынілі мне дзверы ў свет мінулага маіх продкаў. «Першы ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897г. (XXII главы; Мінская губернія 1904г.)», метрычныя кнігі (фонд 136: вопіс 13, вопіс 14, вопіс 19, вопіс 21, вопіс 34), «Кніга Духоўнай кансісторыі Пырашева-Слабодскай царквы Ігуменскага уезду» 1883-1894гг., «Метрычная кніга Мінскай Духоўнай кансісторыі Ігуменскага ўезду аб народжаных, якія бралі шлюб і аб памерлых Слабода-Пырашеўскай Успенскай царквы» 1880-1885гг. і іншыя кнігі патрапілі ў мае рукі. Там я знайшла звесткі пра Вержбіцкага Дамініка – мой дваюрадны прапрапрадзед, які жыў з 1823 па 1908 год і Вяржбіцкага Цярэнція – мой дваюрадны прапрадзед, які жыў з 1878 па 1926 год.

Ва «Усесаюзным перапісе насельніцтва 1926 года» я знайшла прозвішча “Вярбіцкі”. Інфармацыя знаходілася ў паселеных спісах гаспадароў дома, у якія запісвалі галаву сям'і, нацыянальнасць і колькасць мужчын і жанчын, якія жывуцьу доме і на якіх заводзілі асабістыя лісткі. Асабісты лісток – гэта дакумент, у якім падрабязна апісваецца асоба: месца жыхарства, узрост, сямейнае становішча, адукацыя, нацыянальнасць. У час Вялікай Айчыннай вайны была спалена большасць асабістых лісткоў, якія маглі б быць цудоўнай крыніцай падрабязнай інфармацыі пра асобу. Але я знайшла звесткі аб сям’і маіх продкаў: у 1926 годзе стар шым быў Вярбіцкі Мікалай – мой дваюрадны прапрадзед, на той момант ў хаце жылі двое мужчын і чатыры жанчыны, а ў хаце насупраць – Вярбіцкая Мар’я, адзін мужчына і дзве жанчыны.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь далі магчымасць выкупу электроннай версіі архіўных дакументаў. Пасля выкупу неабходных старонак гісторыі я прыступіла да дэтальнага аналізу і структуравання інфармацыі, ствараючы старонку за старонкай сваёй кнігі. Кніга складаецца з 14 раздзелаў. «Старажытныя плямёны»– раздзел, у якім гаворка ідзе пра агульные звесткі з гісторыі Беларусі, асабліва пра родныя мясціны майго бацькі. Другі і трэці разделы прысвечаны майму бацьку: апісваецца яго маленства, характар і звычкі, цікавыя моманты студэнцтва і фотаздымкі. Раздзелы «Інфармацыя аб месцы нараджэння» і «Цікавыя факты аб месцы нараджэння (вёска Чарнічнае)» распавядаюць аб месцы нараджэння маіх продкаў і аб цікавых звестках з гісторыі гэтых мясцін. Наступныя два раздзелы прысвечаны майму дзеду Вярбіцкаму Сцяпану і прадзеду Вярбіцкаму Антону. У раздзеле пра майго прадзеда змешаны факты не толькі пра яго мірнае жыццё. Мне ўдалося знайсці звесткі і пра яго вялікі ўклад у перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. У дзённіку камандзіра 1345 стралковага палка 399 стралковай дывізіі я знайшла запіс: «Вярбіцкі Антон Захаравіч у наступальным баі з 3 па 5.09.1944 года знішчыў буйнакаліберны кулямёт і забіў трох нямецкіх салдат», за што быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

У раздзеле «Дваранскія рады Вяржбіцкіх» ідзе размова пра наяўнасць дваранскіх радоў на тэрыторыі Польшчы з нашым прозвішчам, таксама прыводзяцца звесткі аб імавернай прыналежнасці да аднаго з гэтых дваранскіх радоў. «Архіўныя дакументы» – раздзел, у якім прадстаўлены старонкі з «Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 года», дзе ўпамінаюцца Вярбіцкія. Наступныя два раздзелы прысвечаны архівам, у якіх мне давялося працаваць. «Цікавыя факты» – раздзел, у якім гаворка ідзе пра тыя незвычайныя факты, якія я сустрэла падчас працы, але якія не класіфікаваліся ў папярэднія раздзелы. Напрыклад, продкі маіх бацькоў жылі ў адным уездзе, падчас перапісу насельніцтва 1926 года ў паселеных спісах гаспадароў дома былі дваюрадныя Вярбіцкія, якія ўсынавілі Вярбіцкага Антона Захаравіча, бо яго бацькі незадоўга да перапісу памерлі.

У раздзеле «Значэнне імёнаў» распавядаецца пра імёны маіх продкаў, іх значэнне і прыводзіцца гіпотэза аб прычыне такога выбару імёнаў бацькамі. Апошні раздзел змяшчае схему генеалагічнага дрэва майго рода. Напісанне і аналіз занялі не адзін месяц, а ў выніку – дакладная, зразумелая і цэнная інфармацыя чакала свайго друку. Паслянапісання тэксту я адправілася у друкарню, каб прыдацькнізематэрыяльнывыгляд.

Генеалогія – носьбіт гісторыі роду. Трымаць у руках гісторыю шматлікіх пакаленняў, якія калісьці сталі далёкім пачаткам майго жыццёвага шляху – неацэннае пачуццё.Кожная чарнільная літара праводзіла мяне ў гэты свет гістарычных галаваломак. Разуменне, што з'яўляешся часткай вялікай гісторыі і калісьці таксама ўвойдзеш у яе, прымушае раскрываць свой патэнцыял, развіваць магчымасці і навыкі – расцвітаць з кожным днём, становячыся лепшай версіяй сябе.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1.Ярмаловіч, У.С. Спіс населеных пуктаў Мінскай губерніі / У.С.Ярмаловіч. – Мінск: Губ. друк., 1909. – 231 с.*

*2.Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГАРБ). – Ф.136 воп.13, 14, 19, 21, 34. Арыгінал.*

*3.Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГАРБ). – Пукоўская Георгіеўская царква, 1865.*